# У барацьбе за нацыянальнае адраджэнне (Да 90-годдзя выхаду ў свет першага нумара “Нашай нівы”)

*Мікалай ЗАБАЎСКІ, канд. гіст. навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка*

Расійская рэвалюцыя 1905—1907 гг. дала магутны імпульс да ўздыму нацыянальна-вызваленчых рухаў, абудзіла да палітычнага жыцця шырокія колы грамадства. Ідэалагічным кіраўніком беларускага нацыянальнага руху на пачатку XX ст. з'явілялася Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), партыя леванародніцкага кірунку. 10 лістапада 1906 г. БСГ пачала выдаваць легальную перыядычную газету на беларускай мове “Наша ніва” (першым легальным выданнем была газета “Наша доля”). Апублікаваная ў снежні 1906 г. праграма прадугледжвала скасаванне ўсіх абмежаваных законаў царызму ў дачыненні да мясцовых нацыянальнасцяў, адмену цераспалосіцы і ўтварэнне хугарской гаспадаркі, увядзенне ўсесаслоўнай воласці і асобнага самакіравання для Беларусі, заснаванага на ўсеагульным роўным і прамым выбарчым праве з тайным галасаваннем, а таксама абавязковай бясплатнай народнай асветы з правам вучышча на роднай мове і інш. Найбольш адукаваная частка беларускай інтэлігенцыі з задавальненнем сустрэла выхад газеты, якая была прызвана абудзіць у народа волю і жаданне да нацыянальнага адраджэння. Толькі за 3 гады ад моманту выхаду ў свет першага нумара “Нашай нівы” на старонках газеты былі змешчаны 906 уласных карэспандэнцый з 489 вёсак, мястэчак Беларусі, 246 вершаў 61 паэта і 91 апавяданне 36 пісьменнікаў.

Барацьба супраць шавіністычнай палітыкі царызму, чарнасоценнага расейскага і польскага нацыяналізму стала адным з галоўных напрамкаў у дзейнасці газеты з дру-гой паловы 1907 г. Ва ўмовах панавання чарнасоценных элементаў у палітычным жыцці “Наша ніва” смела называла крайне правых “ворагамі народнай волі”.

На старонках газеты змяшчаліся матэрыялы, якія выкрывалі рэакцыйную дзейнасць мясцовых аддзелаў “Саюза рускага народа”, “Рускага ўскраіннага саюза”, “Сафійскага праваслаўнага брацтва”. Яна абараняла лозунг нацыянальнага адзінства беларускага народа незалежна ад веравызнання, даказвала, што беларусы-праваслаўныя і беларусы-каталікі — адна нацыя. “Сялян-беларусаў, — пісала “Наша ніва”, — раздзялілі на каталікаў і праваслаўных, але нельга забываць, што яны браты, адны ў іх інтарэсы, адзін лёс”.

Падкрэсліваючы адзінства рэакцыйных сіл у барацьбе з нацыянальна-вызваленчым рухам, “Наша ніва” пісала, што польскія і расейскія нацыяналісты “заключылі саюз, каб ваяваць з усімі, хто гаворыць на іншай мове”. Без слоў, без лішніх размоў яны за агульную “работу”, супраць беларускага народа. Аб гэтым “павінны” ведаць і памятаць усе беларусы. Неабходна адзначыць, што “Наша ніва” не ставіла знака роўнасці паміж крайне правымі, з аднаго боку, і расейскім і польскім народамі, з другога.

Газета вяла шырокую выдавецкую працу: арганізоўвала выданне зборнікаў, альманахаў (“Маладая Беларусь”. Пб., 1912—1913, тры кнігі), выпускала “Беларускі каляндар” (1910—1915 гг., Вільня).

"Наша ніва" адыграла выключную ролю ў развіцці беларускай літаратуры, станаўленні розных жанраў беларускага мастацтва, якое ператваралася з аматарскага ў прафесійнае на пачатку XX ст.

Калі газета "Наша доля" звязвала вырашэнне асноўных сацыяльна-эканамічных пытанняў з рэвалюцыяй, "Наша ніва" — з Дзяржаўнай думай. Так, аналізуючы дзейнасць дэпутатаў у IV Думе, "Наша ніва" пісала: "Усе народы маюць сваіх прадстаўнікоў, якія змагаюцца за правы сваёй нацыі. А наша Беларусь пасылае ў Думу толькі чарнасоценных дэпутатаў. Паўловічы ды Юрашкевічы, выступаючы ад беларускіх губерній, толькі робяць школу і крыўду ўсім жыхарам сваімі чалавеканенавісьнымі прамовамі. Другія ўвесь час прасядзяць і слова не вымавіўшы." Дзейнасць "Нашай нівы" садзейнічала кансалідацыі беларускай нацыі, развіццю яе мовы і культуры.

## Беларускі друк у даваеннай Латвіі

*Валер ГЕРАСІМАЎ, загадчык фонду рэдкай кнігі Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь*

Выданні беларусаў Латвіі 1919—1940 гг. — доўгі час terra incognita, праўда пра якую доўга і пільна хавалася кампартыйнымі ідэалагічнымі службамі, — сапраўдны феномен беларускай культуры. Дакладна датаваную гісторыю беларускага друку ў Латвіі можна весці ад 1919 г. Увогуле прапануецца наступная перыядызацыя па праблеме: 1) 1919—1921 гг. (да ліквідацыі Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Латвіі і Эсціі); 2) 1921—1925 гг. (да "Беларускага працэсу"); 3) 1925—1934 гг. (да перавароту К. Ульманіса); 4) 1934—1940 гг. (да савецкай акупацыі Латвіі).

У 1919 г. у Рызе акрэдытуецца Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Латвіі і Эсціі. Ачольваў яе К. Езавітаў. Тут адчыняецца Беларускае прэс-бюро, у мясцовай прэсе пачынаюць асвятляцца праблемы беларусаў. У сакавіку 1920 г. выйшаў першы і, на жаль, апошні нумар "На чужыне" — "беларускага ілюстраванага часопіса ў Латвіі", які ставіў за мэту згуртаваць "усе беларускія сілы, што працуюць на чужыне". Гэта фактычна першы часопіс беларускай дыяспары ў вольным свеце.

Беларуская супольнасць тут становіцца адной з найлепшых за межамі БССР. Працуюць беларускія гімназіі і школы, засноўваецца Беларускае культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына" у Латгаліі, з'яўляецца сталая нацыянальная прэса. Выпушчаная Беларускім аддзелам пры Міністэрстве асветы Латвіі чытанка для дзяцей "Зорка" Аляксандры Смоліч (1922) і зборнік "Ластаўка" выданнем Люцынскай беларускай гімназіі (1924) сталі першынцамі беларускага кнігадруку ў Латвіі.

На "Беларускім працэсе" у 1924—1925 гг. адным з галоўных было абвінавачванне беларускіх дзеячаў у распаўсюджанні сярод насельніцтва і выкарыстанні ў школьным навучанні літаратуры нацыянальна-дэмакратычнага кірунку. "Працэс" падштурхнуў беларусаў да больш актыўнага ўдзелу ў палітычным і грамадскім жыцці. У гэты час пачынаецца трывалая выдавецкая дзейнасць. Каля 20 кніг і брашур, звыш 10 паштовак з партрэтамі беларускіх і латышскіх асобаў надрукавала Беларускае выдавецтва ў Латвіі (1926—1934). Сярод манаграфічных выданняў: п'еса-казка Ф. Аляхновіча "У лясным гушчары" (1932), апавяданне В. Вальтэра "Леснікова сена" (1932), навукова-папулярны нарыс З.